Р.Ф. Харытончык,
метадыст аддзела навукова-метадычнага забеспячэння
інавацыйнага развіцця сферы культуры
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# Прававыя асновы аховы інтэлектуальнай уласнасці ў сферы культуры: выкарыстанне ведаў у прафесійнай дзейнасці работнікаў культуры

Праблемы выкарыстання і кіравання вынікамі інтэлектуальнай дзейнасці ў сучасным свеце выходзяць далёка за рамкі іх аховы. За апошняе дзесяцігоддзе ўзрасла ступень разумення важнасці гэтай сферы для эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі. Амаль у кожнай развітай краіне свету сёння рэалізуюцца спецыялізаваныя праграмы па вывучэнню інтэлектуальнай уласнасці [1]. Усё большую актуальнасць набывае праблема фарміравання кампетэнцыі спецыялістаў розных галін эканомікі, у тым ліку работнікаў культуры. Многія з іх не валодаюць асноўнымі паняццямі па пытаннях аховы інтэлектуальных рэсурсаў, не маюць вопыту кіравання працэсамі аховы, выкарыстання і абароны вынікаў даследаванняў і навукова-тэхнічных распрацовак.

У сувязі з гэтым перад установамі дадатковай адукацыі дарослых паўстала актуальная задача ўключэння гэтых пытанняў у адукацыйныя праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў сферы культуры.

Існуючыя сёння адукацыйныя праграмы ў сферы аховы і кіравання інтэлектуальнай уласнасцю накіраваны на вывучэнне характару і аб'ёму правоў, якія ахоўваюцца ў яе рамках, даюць агульнае ўяўленне аб тых тыпах творчай і тэхнічнай прадукцыі і спосабах іх стварэння, якія могуць ахоўвацца, аб формах аховы канкрэтных відаў аб'ектаў і эфектыўнасці такой аховы. Асноўнымі напрамкамі названых праграм з'яўляюцца прававыя аспекты аховы і выкарыстання аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці.

Большасць з гэтых праграм разлічана на падрыхтаваную аўдыторыю. Разам з тым, выкарыстанне ў выкладанні вобразных ілюстрацый, схем, алгарытмаў, гульнёвых прыёмаў, разлічаных на мультымадальную падачу інфармацыі, дазваляе зрабіць працэс засваення мноства спецыфічных тэрмінаў і вызначэнняў даступным і цікавым, дапамагае рэалізаваць прававую абарону вынікаў творчай дзейнасці [3].

У Інбелкульце вывучэнне праводзіцца ў форме навучальных курсаў і семінараў па канкрэтных аспектах інтэлектуальнай уласнасці. У асноўным яны прызначаны для кіруючых работнікаў і спецыялістаў дзяржаўных устаноў сферы культуры, а таксама для супрацоўнікаў, якія праяўляюць значную цікавасць да заканадаўства аб аўтарскім праве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Арганізуюцца таксама круглыя сталы і пасяджэнні, прысвечаныя змяненням заканадаўства ў гэтай сферы.

Да ўдзелу па рэалізацыі праграм запрашаюцца прадстаўнікі Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаўных устаноў.

Галоўная задача — знаёмства слухачоў з асновамі аховы аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці ў сферы культуры, выпрацоўка ўяўлення аб месцы інтэлектуальнай уласнасці ў развіцці нацыянальнай эканомікі, практычнае прымяненне атрыманых ведаў для кіравання рознымі аб’ектамі.

Акцэнт робіцца на пытанні камерцыялізацыі вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці. Значная ўвага надаецца аспектам разумення ролі навуковых даследаванняў і распрацовак у стварэнні навукаёмістай, канкурэнтаздольнай прадукцыі; неабходнасці рэгулявання этапу стварэння інтэлектуальнага прадукту з боку дзяржавы; усведамлення ролі інтэлектуальнай уласнасці ва ўстойлівым эканамічным росце краіны; засваення яе сутнасці як нематэрыяльнага актыву.

Не апошнюю ролю ў адукацыйным працэсе адыгрывае фарміраванне ў слухачоў паняцця аб эканоміцы інтэлектуальнай уласнасці як асновы забеспячэння камерцыйнай дзейнасці ўстановы культуры; выкарыстанне правоў на аб’екты інтэлектуальнай уласнасці ў якасці нематэрыяльных актываў і іх улік.

Заняткі праходзяць з выкарыстаннем інтэрактыўных метадаў навучання, накіраваных на максімальнае ўцягванне слухачоў у працэс засваення ведаў і навыкаў; праводзіцца разгляд і аналіз праблемных сітуацый, звязаных з рашэннем прафесійных задач.

Дзейнасць устаноў культуры непарыўна звязана са стварэннем і выкарыстаннем установамі культуры твораў літаратуры, навукі і мастацтва, але недастатковыя веды асноў аўтарскага права і сумежных правоў, уласных правоў на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці прыводзяць да парушэнняў дзеючага заканадаўства, неправамернага запазычання карыснай інфармацыі.

Структурна змест заняткаў навучальных курсаў, як правіла, падзяляецца на дзве часткі. Першая з іх прысвечана вывучэнню ролі інтэлектуальнай уласнасці ў сучасным свеце, актуальнасці засваення ведаў у гэтай сферы ў сувязі з прыняццем Дзяржаўнай стратэгіі Рэспублікі Беларусь у сферы інтэлектуальнай уласнасці. Другая частка накіравана на засваенне прынцыпаў і парадку камерцыялізацыі вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці ў сферы культуры, прававых асноў абароны правоў у галіне аўтарскіх і сумежных правоў.

Акрамя навучальных курсаў, Інбелкультам штогод у рамках мерапрыемстваў, прымеркаваных да Міжнароднага дня інтэлектуальнай уласнасці, праводзяцца тэматычныя семінары-пасяджэнні для юрыстаў, эканамістаў і спецыялістаў службаў па ахове і кіраванню інтэлектуальнай уласнасцю арганізацый культуры, падпарадкаваных Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь з удзелам спецыялістаў Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці (НЦІУ), Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь (ДКНТ), Беларускага Інстытута сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы (БелІСА),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навукова-інжынернага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут прыкладных праграмных сістэм» (НІРУП «ІППС»).

У ходзе семінараў удзельнікі знаёмяцца з практычнымі аспектамі рэалізацыі Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах» у сферы культуры, асаблівасцямі пастаноўкі аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці на бухгалтарскі ўлік, іх увядзення ў грамадзянскі абарот і камерцыялізацыі, пытаннямі рэгістрацыі таварных знакаў і іх прымянення для прасоўвання тавараў і паслуг, выканання заканадаўства пры выкарыстанні аб'ектаў аўтарскага права і сумежных правоў у сферы культуры.

Важным з'яўляецца засваенне тэм, звязаных з бухгалтарскім улікам і асноўнымі прынцыпамі справаздачнасці, практычным прымяненнем заканадаўства ў сферы інтэлектуальнай уласнасці ў праектнай дзейнасці арганізацый культуры. У адпаведнасці з Планам першачарговых мерапрыемстваў рэалізацыі стратэгіі Рэспублікі Беларусь у сферы інтэлектуальнай уласнасці на 2012—2020 гады Інбелкультам праводзяцца круглыя сталы па тэмах «Кіраванне аб'ектамі інтэлектуальнай уласнасці ў арганізацыях культуры», «Ахова і кіраванне аб'ектамі інтэлектуальнай уласнасці ў тэатральна-відовішчных арганізацыях».

Для метадычнага забеспячэння выкладання асноў інтэлектуальнай уласнасці Інбелкультам выкарыстоўваюцца інфармацыйна-метадычныя матэрыялы для сістэмы ДАД «Аб'екты інтэлектуальнай уласнасці ў сферы культуры», якія прызначаны для спецыялістаў галіновых служб па ахове і кіраванню інтэлектуальнай уласнасцю [2].

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Грачев, С.В.* Преподавание основ интеллектуальной собственности в системе последипломного образования / С.В. Грачев, Е.А. Волкова // Вестник Российской академии мед. наук. — 2008. — № 3. — С. 22—24.
2. Объекты интеллектуальной собственности в сфере культуры : инструкт.-метод. материалы для слушателей курсов повышения квалификации / сост. Р.Ф. Харитончик., А.В. Бичурин. — Минск : ГУО «Институт культуры Беларуси», 2014. — 140 с.
3. *Хмеленкова, Л.В., Пуляевская, О.В.* Новая технология обучения основам интеллектуальной собственности в инновационной деятельности // Современные проблемы науки и образования [Электронный ресурс]. — 2006. — № 2. — С. 81—83; Режим доступа : URL: http://www.science-education.ru/ru/article/view?id=234. — Дата доступа : 25.05.2016.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ